# Беларускі «Буквар» — у тампліераў!

---

- 14.05.2016

**Старшыня Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь Суша змог папрацаваць у прыватнай лонданскай бібліятэцы ордэна тампліераў і зрабіць там сенсацыйную знаходку — даказаць, што першы «Буквар» быў выдадзены на тэрыторыі колішняй беларускай дзяржавы.**

---



У свеце захаваліся толькі два асобнікі гэтага ўнікальнага выдання. Адзін з іх, няпоўны, знаходзіцца ў Даніі, у Каралеўскай бібліятэцы. А другі (поўны) экзэмпляр — у Вялікабрытаніі, у Бібліятэцы Мідл Тэмпла, (размяшчаецца ў гістарычным раёне Лондана Тэмпл, дзе некалі мелі сваю рэзідэнцыю славутыя рыцары-тампліеры).

Тое, што беларусу ўдалося трапіць туды, можна назваць сапраўднай удачай. Дагэтуль ні ў аднаго з айчынных даследчыкаў не было магчымасці ўбачыць «Буквар» на свае вочы (ва ўсякім разе, звестак пра гэта не захавалася). Алесь Суша адзначае:

— Дзякуючы спрыянню брытанскіх беларусістаў, прафесараў Лонданскага ўніверсітэта і перш за ўсё Джыма Дынглі, у мяне з'явілася магчымасць вывучыць гэты надзвычай каштоўны помнік нашай культуры і нават зрабіць некаторыя копіі.

На радзіме ніводнага асобніка не захавалася: іх проста «зачыталі да дзірак», як часта бывае з вучэбнымі выданнямі. Можна сказаць, нам пашанцавала, што адна з тых кніг яшчэ ў пачатку XVII стагоддзя была вывезена ў Лондан калекцыянерам вучэбных выданняў Робертам Эшлі. У далейшым яна трапіла ў закрыты для знешняга свету збор лонданскіх барыстараў (карпарацыю адвакатаў), дзе захоўваецца і сёння.

Даследчыку ўдалося высветліць, што гэтае выданне пабачыла свет 24 ліпеня 1618 года ў друкарні Віленскага Свята-Духава праваслаўнага брацтва ў Еўі — мястэчку ў Віленскай губерні, якое калісьці належала князям Агінскім. Гэта было адно з самых старадаўніх і ўплывовых беларускіх выдавецтваў у Вялікім Княстве Літоўскім, якое выпускала нямала кніг на царкоўнаславянскай, старабеларускай і польскай мовах. У 1619 годзе там была надрукавана «Граматыкі славенскія правілное сінтагма» Мялеція Сматрыцкага. А кніга, якую ўдалося ўбачыць Алесю Сушу, стала першай у свеце пад назвай «Буквар».

Навуковец адзначае, што ў 2018 годзе мы маем магчымасць адсвяткаваць 400-годдзе беларускага «Буквара». Да таго часу варта было б выпусціць факсімільнае выданне, правесці канферэнцыю, а таксама стварыць Музей буквара.